# ХАТЫНЬ. У ПАМЯЦІ НАЗАЎСЁДЫ

***Хатынь – гэта не проста спаленая вёска, гэта сімвал пакут мірных беларусаў, чорная старонка нашай гісторыі, якая была напісана 22 сакавіка 1943 года. З нагоды 80-й гадавіны са дня жудаснай трагедыі, у якой загінулі 149 мірных вяскоўцаў, з якіх 75 – дзеці да 16 гадоў, па ўсёй краіне прайшлі памятныя мерапрыемствы.***

У 12.00 ва ўстановах адукацыі, на прадпрыемствах і ў арганізацыях адбылася хвіліна маўчання.

У ВДУ супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты сабраліся не толькі ў актавай зале. У кожнай вучэбнай аўдыторыі акурат у гэты час машэраўцы адклалі ўсе справы, каб успомніць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і яшчэ раз задумацца аб тым, што неабходна берагчы мір, не дапусціць паўтарэння тых падзей і разам імкнуцца ў светлую будучыню.



Дарэчы, памятныя мерапрыемствы прайшлі ў гэты дзень і на тэрыторыі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», дзе быў адкрыты новы музей «Кожны трэці». Да слова, летам праводзілася рэканструкцыя комплексу, у якой прымалі ўдзел і студэнты ВДУ ў складзе атрада «Машэраўцы».

Трагедыі Хатыні, гісторыі стварэння мемарыяльнага комплексу і крымінальнай справе аб генацыдзе беларускага народа, што распачала Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь, быў прысвечаны адзіны дзень інфармавання «80 гадоў трагедыі Хатыні. Вынікі расследавання генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». У ролі спікера выступіў дацэнт кафедры гісторыі і культурнай спадчыны ВДУ Расціслаў Цімафееў. Ён нагадаў, што стала прычынай трагедыі 22 сакавіка 1943 года, хто вінаваты ў спальванні Хатыні і забойстве яе жыхароў, каму з хатынцаў і якім чынам удалося выратавацца ад куль і агню. Надаў увагу лектар і тэме будаўніцтва мемарыяла, адзначыў, з чаго складаецца экспазіцыя і што менавіта постаць адзінага выжыўшага дарослага жыхара вёскі Іосіфа Камінскага з целам мёртвага сына на руках стала цэнтральнай фігурай.

Акрамя таго, Расціслаў Уладзіміравіч зазначыў, што на сённяшні момант 8331 пахаванне знаходзіцца на ўліку ў рэспубліцы, з іх 1626 – прысвечана ахвярам вайны, і гэты спіс папаўняецца. У апошнія гады ў рамках крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа следчыя знаходзяць новыя пахаванні загінуўшых, што не былі ўлічаны раней, сведчанні відавочцаў зверстваў фашыстаў і іх пасобнікаў.

Падрабязна пра генацыд беларускага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны можна было даведацца з выставы «Ґенацыд. Помніць усё. Помніць кожнага», што была прадстаўлена ў фае. Не засталіся ў баку ад памятнай трагічнай даты студэнты і выкладчыкі факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый, якія правялі дэкаду, прысвечаную Дню памяці ахвяр Хатынскай трагедыі пад дэвізам «Аб чым нагадваюць званы Хатыні».

**Здымак Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фотарэпартаж з хвіліны маўчання глядзіце з дапамогай QR-кода.